**© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

**РТ–2025/2026 гг. Этап II**

# Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

## Варыянт 2

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А (16 *заданняў) і часткі* В (22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

## Частка А

*У кожным заданні часткі* А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Зараджэнне земляробства на тэрыторыі Беларусі адбылося ў:**
1) 24-м тыс. да н. э.;
2) 22–21-м тыс. да н. э.;
3) сярэдзіне 3-га тыс. да н. э.;
4) 2 тыс. да н. э.;
5) VII ст. да н. э.

**А2. Працэс засваення балтамі рыс славянскай культуры, мовы, традыцый атрымаў назву:**
1) каранізацыя;
2) урбанізацыя;
3) славянізацыя;
4) нацыяналізацыя;
5) беларусізацыя.

**А3. Вызначце алфавіт, якім напісаны тэкст Тураўскага евангелля:**
1) лацініца;
2) кірыліца;
3) глаголіца;
4) фінікійскі;
5) грэчаскі.

**А4. Вызначце правільнае сцверджанне адносна палітычнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у Познім сярэднявеччы.**
1) У Англіі сфарміравалася абмежаваная манархія.
2) Генеральныя штаты ў Францыі складаліся з дзвюх палат.
3) Узмацнілася феадальная раздробленасць.
4) Першыя рэспублікі з'явіліся ў іспанскіх гарадах.
5) У Заходняй Еўропе не склаліся цэнтралізаваныя дзяржавы.

**А5. Адзначце падзею, якая адбылася ў 1399 г.:**
1) заключэнне Крэўскай уніі;
2) бітва пад Оршай;
3) бітва на р. Ворскле;
4) каранацыя Міндоўга;
5) падпісанне Востраўскага пагаднення.

**А6. Паводле Люблінскай уніі агульнай(-ым) для Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Польшчы ў складзе Рэчы Паспалітай была(-о):**

1) дзяржаўная пячатка;
2) заканадаўства;
3) знешняя палітыка;
4) судовая сістэма;
5) грашовая адзінка.

**А7. Вызначце асноўную павіннасць сялян у ВКЛ на карысць землеўладальнікаў у другой палове XVI ст.:**

1) талака;
2) гвалт;
3) дзесяціна;
4) дзякла;
5) паншчына.

**А8. Пратэстантаў у Швейцарыі называлі:**

1) кальвіністамі;
2) лютэранамі;
3) гугенотамі;
4) езуітамі;
5) уніятамі.

**А9. Вынікі напалеонаўскіх войнаў былі падведзены на (у ходзе):**

1) Венскім кангрэсе;
2) рэвалюцыі Мэйдзі;
3) ліпеньскай рэвалюцыі ў Францыі;
4) Парыжскай канферэнцыі;
5) падпісання Вестфальскага міру.

**А10. Мэтай рэформы П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы была(-о):**

1) ліквідацыя прыгоннага права;
2) стварэнне фермерскіх гаспадарак;
3) разбурэнне сялянскай абшчыны;
4) стварэнне таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі;
5) паляпшэнне становішча дзяржаўных сялян.

**А11. Адной з задач сталыпінскай аграрнай рэформы была(быў; -о):**

1) адмена часоваабавязанага становішча сялян;
2) дазвол свабоднага выхаду сялян з абшчыны;
3) спыненне арэнды дзяржаўных зямель;
4) правядзенне палітыкі «апякунства» над сялянамі;
5) увядзенне выкупных плацяжоў.

**А12. Устанавіце адпаведнасць.**

| **Эканамічная палітыка** | **Мерапрыемства** |
|---|---|
| 1) палітыка «ваеннага камунізму»<br>2) новая эканамічная палітыка (НЭП) | а) правядзенне грашовай рэформы<br>б) натуралізацыя і ўраўняльнасць у заробках<br>в) увядзенне размеркавання прадуктаў па картках<br>г) прыцягненне замежнага капіталу<br>д) нацыяналізацыя прамысловасці<br>е) дазвол рыначных адносін |

1) 1авг; 2бде;
2) 1бде; 2авг;
3) 1аге; 2бвд;
4) 1вгд; 2абе;
5) 1бвд; 2аге.

**А13. Штурм Брэсцкай крэпасці нямецка-фашысцкімі войскамі пачаўся:**

1) 1 верасня 1939 г.;
2) 22 чэрвеня 1940 г.;
3) 9 мая 1941 г.;
4) 22 чэрвеня 1941 г.;
5) 28 чэрвеня 1941 г.

**А14. Адной з характэрных рыс сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. быў (было):**

1) пачатак так званай «спажывецкай рэвалюцыі»;
2) пераважнае развіццё прыборабудаўнічай, радыётэхнічнай галін;
3) скарачэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання;
4) пераважнае развіццё прыватнага сектара сельскай гаспадаркі;
5) значнае скарачэнне колькасці гарадскога насельніцтва.

**А15. VI Усебеларускі народны сход пад лозунгам «Адзінства! Развіццё! Незалежнасць!» адбыўся ў:**

1) 2006 г.;
2) 2010 г.;
3) 2016 г.;
4) 2021 г.;
5) 2022 г.

**А16. Вызначце дзяржаву, якая паспяхова змагла супрацьстаяць «каляровым рэвалюцыям»:**

1) Грузія;
2) Егіпет;
3) Лівія;
4) Іран;
5) Сірыя.

## Частка В

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

**В1. Устанавіце адпаведнасць.**

| Этап развіцця першабытнага грамадства | Характарыстыка |
|---|---|
| А) праабшчына<br>Б) радавая абшчына<br>В) суседская абшчына | 1) дзяленне членаў абшчыны на класы<br>2) на чале абшчыны стаяў старэйшына<br>3) складалася з 20–30 чалавек, мела няўстойлівы склад<br>4) існавала пераважна прыватная ўласнасць<br>5) спалучэнне індывідуальнага і калектыўнага землекарыстання |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б5В3.**

**В2. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная падзея | Дата |
|---|---|
| А) стварэнне Тураўскай епархіі<br>Б) раскол хрысціянскай царквы на праваслаўную і каталіцкую<br>В) падзенне Заходняй Рымскай імперыі<br>Г) захоп кіеўскім князем Мсціславам Полацкай зямлі і высылка мясцовых князёў у Візантыю | 1) 476 г.<br>2) 1005 г.<br>3) 1054 г.<br>4) 1101 г.<br>5) 1129 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* А1Б4В3Г5.**

**В3. Вызначце правільныя сцверджанні адносна распаўсюджвання хрысціянства на тэрыторыі Беларусі ў X–XIII стст.**

1) Першым князем-хрысціянінам быў Ізяслаў – сын Рагнеды і Уладзіміра.
2) Хрысціянізацыя першапачаткова ахапіла сельскіх жыхароў.
3) Хрысціянізацыя першапачаткова ахапіла жыхароў гарадоў.
4) Прыняцце хрысціянства спрыяла зніжэнню аўтарытэту княжацкай улады.
5) У X ст. была створана Берасцейская епархія.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**В4.** Пагадненне 1385 г. аб дынастычным саюзе паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай атрымала назву __________.

***Адказ запішыце словам (або словамі без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў) у форме назоўнага склону.***

**В5. Вызначце характэрныя рысы развіцця культуры краін Заходняй Еўропы ў другой палове XIII – XV ст.:**

1) з'явіліся першыя прыватныя школы;
2) звужалася сфера прымянення лацінскай мовы;
3) ствараліся вялікія бібліятэкі пры ўніверсітэтах;
4) універсітэты паступова вызваляліся ад папскага ўплыву;
5) з'явіліся першыя ўніверсітэты.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В6. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця ВКЛ у XIV–XV стст.:**

1) Эканамічнай асновай феадальнага грамадства з'яўлялася ўласнасць феадалаў на зямлю.
2) Значнае развіццё атрымала царкоўнае землеўладанне.
3) Вярхоўным уласнікам зямлі з'яўляўся вялікі князь (гаспадар).
4) Распаўсюджанай формай феадальнага землеўладання былі «выслугі».
5) Завяршыўся працэс запрыгоньвання сялян.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**В7. Устанавіце паслядоўнасць падзей.**
1) Заключэнне Фларэнтыйскай царкоўнай уніі;
2) выданне Ф. Скарынам друкаванай кнігі «Псалтыр»;
3) наданне Бярэсцю магдэбургскага права;
4) стварэнне англійскага парламента;
5) заключэнне Люблінскай уніі.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:*** **12345.**

**В8.** Культурна-філасофскі рух у Еўропе ў XVIII ст., звязаны з пашырэннем навуковых ведаў і ідэі свабоды чалавека, – **гэта __________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В9. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Гістарычная падзея |
|---|---|
| А) Свідрыгайла<br>Б) Ян Гус<br>В) Міндоўг<br>Г) Т. Касцюшка | 1) утварэнне ВКЛ<br>2) бітва пад Вількамірам<br>3) паўстанне 1794 г.<br>4) чэшскі прапаведнік, мысляр, рэлігійны рэфарматар<br>5) канчатковае ўключэнне Полацкай зямлі ў склад ВКЛ |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В10. Вызначце правільныя сцверджанні адносна Контррэфармацыі ў ВКЛ.**
1) Контррэфармацыя была сродкам палітычнага дыстанцыравання ад Рэчы Паспалітай.
2) Садзейнічала аслабленню ўплыву каталіцкай царквы на жыццё грамадства.
3) Садзейнічала працэсу паланізацыі шляхты.
4) Была накіравана супраць праваслаўных.
5) Праводзілася больш жорсткімі метадамі, чым у Заходняй Еўропе.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **12.**

**В11. Для сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у першай палове XVIII ст. было характэрна:**
1) зніжэнне таварнасці сельскай гаспадаркі;
2) перавага прымусовага найму рабочай сілы;
3) узнікненне мануфактурнай вытворчасці;
4) паглыбленне дыферэнцыяцыі ў вёсцы, якое садзейнічала стварэнню рынку рабочай сілы;
5) абвастрэнне канфліктаў паміж гараджанамі і сялянамі.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**B12. Устанавіце адпаведнасць.**

| Характарыстыка | Гістарычная асоба |
|---|---|
| А) вучоны-прыродазнаўца, дырэктар Віленскай абсерваторыі, заснаванай у 1753 г., рэктар Галоўнай школы ВКЛ<br>Б) англійскі вучоны, які сфармуляваў тэорыю эвалюцыі<br>В) венецыянец, які здзейсніў шматгадовае падарожжа ў Кітай і Цэнтральную Азію, аўтар «Кнігі аб разнастайнасці свету»<br>Г) мастак, прадстаўнік рамантызму ў партрэтным жывапісе | 1) Майкл Фарадэй<br>2) Чарльз Дарвін<br>3) Валенцій Ваньковіч<br>4) Марцін Пачобут-Адляніцкі<br>5) Марка Пола |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**B13. Вызначце тэндэнцыі гістарычнага развіцця ў XIX ст.:**

1) У сацыяльнай структуры грамадства ў Заходняй Еўропе адбываліся змены.
2) Феадальная эканоміка замяніла капіталістычную.
3) У шэрагу еўрапейскіх краін умацавалася ідэалогія фашызму.
4) Адбываўся працэс мадэрнізацыі грамадства.
5) Адным з дамінуючых класаў заходнееўрапейскага грамадства становіцца буржуазія.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**B14. Адзначце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *першай* сярод пералічаных:**

1) правядзенне Полацкага царкоўнага сабору;
2) першае прымяненне Германіяй хімічнай зброі каля г. Іпр;
3) прыняцце Маніфеста аб адмене прыгоннага права ў Расіі;
4) Айчынная вайна з Напалеонам;
5) I з’езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП).

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**B15.** Права ўнутранага самакіравання, якое даецца асобнай тэрыторыі або народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы, – **гэта __________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B16.** Абвяшчэнне Турцыі рэспублікай адбылося 23 кастрычніка _____ **года**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**B17. Выкарыстоўваючы картасхему, вызначце правільныя сцверджанні адносна фарміравання тэрыторыі БССР.**




1) «Лінія Керзана» з'яўлялася граніцай БССР у 1921 г.
2) Заштрыхаваная на картасхеме тэрыторыя БССР сфарміравалася пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора.
3) Тэрыторыя БССР канчаткова аформілася пасля падпісання Брэсцкага мірнага дагавора.
4) Гарады Мінск, Барысаў, Ігумен, Бабруйск, Слуцк, Мазыр у 1920-я гг. былі ў складзе БССР.
5) У 1921 г. са складу Украінскай ССР у склад Беларускай ССР была перададзена частка тэрыторыі.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**B18.** Генеральны план нацысцкай Германіі па каланізацыі і германізацыі акупаваных зямель Усходняй Еўропы, уключаючы захопленыя тэрыторыі СССР, атрымаў назву «__________».

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B19. Вызначце правільныя сцверджанні адносна палітычнага развіцця БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.**

1) Была прынята новая Канстытуцыя БССР.
2) Актывізавалася дзейнасць камсамола і прафсаюзаў.
3) Адбывалася назначэнне на кіруючыя пасады ў БССР былых камандзіраў партызанскага руху.
4) Савет Міністраў БССР з’яўляўся вышэйшым органам заканадаўчай улады.
5) Зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга БССР адбылося ў 1951 г.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**B20.** Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі быў падпісаны 8 снежня _____ **года**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:*** **1900.**

**B21. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў другой палове XX – першай чвэрці XXI ст.**

1) Спыненне Вялікабрытаніяй членства ў Еўрапейскім саюзе (ЕС);
2) стварэнне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ);
3) пачатак серыйнага выпуску трактароў на Мінскім трактарным заводзе;
4) прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа»;
5) абвяшчэнне яўрэйскім насельніцтвам Палесціны дзяржавы Ізраіль.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:*** **12345.**

**B22. Устанавіце адпаведнасць.**

| **Гістарычная падзея** | **Дата** |
|---|---|
| А) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі | 1) 1996 г. |
| Б) падпісанне Дагавора аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) | 2) 1997 г. |
| В) падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі | 3) 2014 г. |
| Г) Рэспубліка Беларусь афіцыйна стала краінай – партнёрам БРІКС | 4) 2020 г. |
| | 5) 2024 г. |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**